# ПАХОДЖАННЕ РОДУ І АДУКАЦЫЯ ТАДЭВУША РЭЙТАНА

***Жлутка А.***

У сваім паведамленні А. Жлутка прывёў дзве версіі паходжання роду Рэйтанаў: легендарную – са Швецыі і больш абгрунтаваную – з славянскай часткі Прусіі. На аснове аналізу ранніх адіменных тапонімаў ён прыйшоў да высновы, што прозвішча "Рэйтан", які і род Рэйтанаў – славянскага паходжання.

На падставе зместу двух лацінамоўных лістоў бацькі Тадэвуша Рэйтана – Дамініка, ён пацвердзіў слушнасць меркавання Змітра Юркевіча пра час нараджэння Тадэвуша – у 1740 г. блізка альбо на само свята св. Юды Тадэвуша, якое адзначаецца 28 кастрычніка.

У паведамленні таксама былі абмеркаваныя тры месцы, дзе мог атрымаць сярэднюю гуманітарную адукацыю Тадэвуш Рэйтан: Віленская езуіцкая акадэмія, Наваградскі езуіцкі калегіюм і найбольш верагодны, таксама і паводле меркавання З. Юркевіча – Нясвіжскі калегіюм.

А. Жлутка ахарактарызаваў сістэму езуіцкай адукацыі, і лад навучання ў калегіюме, тым самым асвятліўшы тыя акалічнасці і атмасферу, у якой вучыўся Тадэвуш Рэйтан.